N E W S L E T T E R

BELARUS Live

www.Belarus-Live.eu

20.03.2009 — 26.03.2009

МЗС Беларусі выступае супраць забароны на імпарт тавараў

«Газпрам» можа зьнізіць цану газу для Беларусі

У Беларусі будзе створаны Грамадзкі савет па маральнасьці

Мілінкевіч называе апазыцыю маргінальнай і ня лічыць, што ў Беларусі ёсьць палітвязьні

У 2009 годзе аб’ём гандлю з Расеяй можа скараціцца напалову

Беларускі журналіст 4 гады пісаў кнігу пра народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава



photo.bymedia.net

На мінулым тыдні ў беларускіх СМІ і палітычных колах найбольш заўважнымі былі тры тэмы: сьвяткаваньне 91-й гадавіны абвяшчэньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР), сустрэчы Лукашэнкі ў Сочы зь Мядзьведзевым і Пуціным, а таксама кіраўніком Абхазіі і валютная ўгода з Кітаем у памеры 2,8 млрд даляраў.

Публічнае сьвяткаваньне 25 сакавіка гадавіны абвяшчэньня БНР набыло рэгулярны характар у гады незалежнасьці Беларусі. Арганізатарамі дэманстрацыяў, іншых акцыяў, мерапрыемстваў заўжды выступалі Беларускі Народны Фронт ды іншыя апазыцыйныя партыі, арганізацыі і грамадзкія ініцыятывы. Стаўленьне кіруючага рэжыму да гэтых мерапрыемстваў апазыцыі ў Дзень Волі шмат у чым заўжды залежала ад масавасьці ўдзельнікаў і настрою кіраўніка. У гэты раз ля будынка Нацыянальнай Акадэміі навук сабралася некалькі тысяч чалавек. Асаблівасьцю сёлетняй акцыі ў цэнтры Менску было тое, што яна адбылася падчас хады дыялёгу рэжыму з Эўразьвязам і запрашэньня Беларусі ўдзельнічаць у праграме «Ўсходняе партнэрства». Працягваюцца таксама размовы, чаканьні з нагоды магчымага прыезду Лукашэнкі ў Прагу, дзе павінен прайсьці саміт краінаў Эўразьвязу і 6 краінаў-удзельніцаў праграмы «Ўсходняе партнэрства». Гэтыя абставіны цалкам заканамерна дазвалялі меркаваць, што ў гэты раз улады ўстрымаюцца ад разгону дэманстрантаў і масавых арыштаў. Было зафіксавана толькі некалькі прэвэнтыўных затрыманьняў актывістаў у рэгіёнах краіны. Сапраўды масавага сьвята не атрымалася шмат у чым з-за раздробленасьці апазыцыйных сілаў і непрымірымых рознагалосьсяў паміж іх лідэрамі. Зьвяртае на сябе ўвагу той факт, што ў аргкамітэт па правядзеньні Дня Волі не ўвайшоў экс-кандыдат у прэзыдэнты Аляксандар Мілінкевіч са сваім рухам «За свабоду». На самім сьвяточным мерапрыемстве ён прысутнічаў, аднак астатнія ўдзельнікі не надалі яму асаблівай увагі. Што тычыцца

другога былога экс-кандыдата ў прэзыдэнты і палітзьняволенага Аляксандра Казуліна, то 25 сакавіка ён у Празе сустракаўся зь міністрам замежных справаў Чэхіі Карлам Шварцэнбэргам. Яны размаўлялі пра праграму «Ўсходняе партнэрства» і магчымы прыезд Лукашэнкі на саміт у чэскую сталіцу 7 траўня. На думку Казуліна, беларускага кіраўніка нельга запрашаць на гэты саміт.

А ў Менску ў гэты дзень, у прысутнасьці шматлікіхназіральнікаў з дыпляматычнага корпусу ды іншых, сьвяткаваньне Дня Волі скончылася без асаблівых інцыдэнтаў.

Кіраўнік Беларусі, які адсутнічаў у Менску амаль пяць дзён, вярнуўся з Сочы, пасьпеўшы там яшчэ пакамунікаваць і з патрыярхам Маскоўскім і Ўсёй Русі Кірылам. Афіцыйна паведамлялася, што ў Сочы Лукашэнка быў у адпачынку, падчас якога абмяркоўваў і важныя пытаньні беларуска-расейскіх дачыненьняў. Да гэтых пытаньняў адносіцца затрымка прызнаньня Менскам незалежнасьці двух расейскіх пратэктаратаў – Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Масква ўсё заўважней праяўляе нэрвознасьць і прысьпешвае Лукашэнку зрабіць гэта. Менавіта гэтая тэма была галоўнай на сустрэчы Лукашэнкі з кіраўніком Абхазіі Багапшам. Ёсьць нагоды меркаваць, што пытаньне юрыдычнага прызнаньня Абхазіі, зь якой рэжым Лукашэнкі ўжо шмат гадоў падтрымлівае і разьвівае гандлёва-эканамічныя дачыненьні, усё ж будзе вырашана Беларусьсю усьлед за Расеяй.

У Маскве не хаваюць сваёй заклапочанасьці з нагоды запрашэньня Беларусі ў праграму «Ўсходняе партнэрства», нягледзячы на некаторыя заявы заходніх палітыкаў, што супрацоўніцтва ў межах гэтай праграмы пакуль толькі мяркуецца. Прызнаньнем незалежнасьці Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі Лукашэнка сам сябе абмяжуе ў праграме «Ўсходняе партнэрства», у адрозьненьне ад астатніх яе чальцоў, якія працягваюць не прызнаваць незалежнасьць гэтых частак грузінскай дзяржавы. Дарэчы, адной з удзельніцаў праграмы зьяўляецца сама Грузія, захаваньне тэрытарыяльнай цэласнасьці якой рашуча падтрымліваюць ЭЗ і ЗША. Хутчэй за ўсё, зь Беларусьсю ў рамках гэтай праграмы ЭЗ будуць падтрымліваць дачыненьні на тэхнічным узроўні. На думку многіх экспэртаў, час удалага дагэтуль лавіраваньня Лукашэнкі паміж ЭЗ і Расеяй бясконцым быць ня можа і павінен хутка скончыцца. Можа быць, адначасова са зьяўленьнем у Беларусі паўнамаштабных наступстваў сусьветнага фінансава-эканамічнага крызысу. Ёсьць нагоды меркаваць, што трывога з-за нарастаючага для беларускай эканомікі жорсткага крызысу, які, безумоўна, выкліча заўважную сацыяльна-палітычную напружанасьць у краіне, прымусіла кіраўніка Беларусі цэлыя пяць нялёгкіх для яго дзён правесьці ў Расеі. Можна спадзявацца, што Лукашэнка ў характэрным для яго стылі сам распавядзе ў сваіх публічных выступах пра тое, пра што сапраўды зь ім гутарылі Мядзьведзеў і Пуцін у Сочы. Для многіх у Эўропе гэта можа стаць сэнсацыяй.

А пакуль сэнсацыяй стала вестка, што Нацыянальны банк Беларусі заключыў з Народным банкам Кітаю пагадненьне пра правядзеньне валютнай угоды своп. У яе межах Беларусь атрымае 20 млрд. юаняў, а Кітай – 8 трлн. беларускіх рублёў – сумы, раўназначныя прыкладна 2,8 млрд. USD. Гэтыя рэсурсы абодва бакі абяцаюць выкарыстаць ва ўзаемным гандлі. Камэнтуючы факт угоды, кіраўнік Нацыянальнага банку Беларусі Пётар Пракаповіч падкрэсьліў, што такім чынам краіны сыходзяць ад выкарыстаньня даляра ва ўзаемных разьліках. Праўда, дзеяньне дамоўленасьцяў з Кітаем разьлічанае на тры гады, хаця і можа быць працягнута. Такім чынам, у 2012 г. партнэры маюць поўнае права «закрыць рахунак» – запатрабаваць нявыдаткаваную рэшту назад. Якой будзе гэтая сума, сёньня прадбачыць немагчыма. Затое пакуль беларускім экспартэрам ня прыйдзецца прадаваць валютную выручку, якая паступае з Кітаю.

Камэнтуючы гэтае пагадненьне, некаторыя экспэрты зьвярнулі ўвагу на ня менш сэнсацыйны яго зьмест. Як высьветлілася, пакуль няма ніякай угоды – ёсьць толькі нейкі мэмарандум пра палітычную гатоўнасьць бакоў заключыць такую ўгоду. Для таго каб 20 млрд. кітайскіх юаняў паступілі ў Нацыянальны банк Беларусі, яшчэ неабходна распрацаваць і падпісаць крэдытнае пагадненьне, у якім будуць абумоўленыя ўсе дэталі ўгоды – стаўкі, даты валютаваньня, мэтавае прызначэньне і да т.п., то бок вялізны пералік пытаньняў, на ўзгадненьне якіх сыдзе не адзін і ня два месяцы.

АФІЦЫЙНА

## МЗС Беларусі выступае супраць забароны на імпарт тавараў


photo.bymedia.net

***Беларусь павінна не татальна змагацца зь імпартам, а больш актыўна выкарыстаць дазволеныя ў сусьветным гандлі меры абароны ўнутранага рынку. Такую заяву зрабіў намесьнік міністра замежных справаў Беларусі Андрэй Еўдачэнка.***

Паводле ягоных словаў, трэба змагацца толькі зь несправядлівым імпартам, які ажыцьцяўляецца па скажоных схемах, на няправільных эканамічных умовах, падрываючы тым самым канкурэнцыю ў краіне.

Чыноўнік падкрэсьліў, што неабходна сыходзіць ад сыстэмы мераў, несумяшчальных з правіламі міжнароднага гандлю. А. Еўдачэнка перакананы, што беларускія прадпрыемствы недастаткова выкарыстоўваюць антыдэмпінгавыя, кампэнсацыйныя і адмысловыя ахоўныя меры, дазволеныя ў сусьветным гандлі.

*«Інтэрфакс»*

ПАЛІТЫКА

## «Газпрам» можа зьнізіць цану газу для Беларусі

***Беларусь працягвае перамовы з «Газпрамам» і ўрадам Расеі наконт вяртаньня ў разьліках да сярэднегадавой цаны. Менск прапануе ўсталяваць гэтую цану на ўзроўні $148 за тысячу кубамэтраў і захаваць яе да верасьня, а ў канцы году правесьці пераацэнку.***

У чацьвертым квартале, паведамляе выданьне, беларускі бок прагназуе цану тысячы кубамэтраў газу ў памеры $90. Свае прапановы Беларусь матывуе наступствамі фінансавага крызысу. Экспэрты, апытаныя «Камэрсантам», ня выключаюць, што расейскі бок, які таксама аказаўся ў зусім няпростай сытуацыі, падтрымае саюзьніка. Дырэктар «East European Gas Analysis» Міхаіл Карчомкін мяркуе, што ігнараваньне прапановаў можа прывесьці да скрайніх мераў, а перапынкі ў пастаўках газу па газаправодзе Ямал-Эўропа абыдуцца Расеі даражэй, чым разьлікі па сярэднегадавой цане газу.

*«Коммерсантъ»*

ГРАМАДЗТВА

## У Беларусі будзе створаны Грамадзкі савет па маральнасьці


photo.bymedia.net

***Ідэя наконт стварэньня Грамадзкага савету па маральнасьці была выказаная год таму на Сынодзе Беларускай праваслаўнай царквы.***

Зараз падбіраюцца кандыдатуры. У савет ўвойдуць сьвятары, вядомыя грамадзкія дзеячы, людзі культуры, мастацтвы і навукі.

Як адзначылі сьвятары, сёньня насьпела неабходнасьць маніторыць СМІ на прадмет жорсткасьці, гвалту і пошласьці. Адсочваючы перадачы і фільмы, Грамадзкі савет па маральнасьці мае намер змагацца за чысьціню інфармацыі, якую атрымліваюць гледачы.

Мяркуецца, што рашэньні Грамадзкага савету па маральнасьці ў Беларусі будуць рэкамэндацыйнымі.

*«Хартыя'97»*

АПАЗЫЦЫЯ

## Мілінкевіч называе апазыцыю маргінальнай і ня лічыць, што ў Беларусі ёсьць палітвязьні


photo.bymedia.net

*Лідэр руху «За свабоду» зрабіў некалькі спрэчных заяваў.*

25 сакавіка на прэсавай канфэрэнцыі ў Менску Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што беларуская апазыцыя не ўдзельнічае ў перамовах афіцыйнага Менску і прадстаўнікоў эўрапейскіх структураў з-за сваёй маргінальнасьці.

«Было шмат размоваў, чаму беларуская апазыцыя не прымае ўдзелу ў перамовах беларускіх уладаў і Захаду. Яна не заслужыла гэтага, таму што стала маргінальнай, слабой», – заявіў палітык. «Мы менш сталі ўплываць на грамадзтва. Нам трэба вырашаць пытаньне не з Эўразьвязам, што нас кудысьці не паклікалі і не пасадзілі за нейкі стол, а трэба вырашаць пытаньне пра свой уплыў на беларускае грамадзтва», – лічыць Мілінкевіч.

Таксама Аляксандар Мілінкевіч заявіў, што ня лічыць, што ў Беларусі ёсьць палітвязьні: «Я стаю на той пазыцыі, што палітвязьнем чалавека можна называць тады, калі пройдзе суд, калі праваабаронцы і міжнародныя арганізацыі скажуць, што гэта палітвязень».

*«Інтэрфакс»*

ЭКАНОМІКА

## У 2009 годзе аб'ём гандлю з Расеяй можа скараціцца напалову

***У 2008 годзе Беларусь выціснула максымум з рынку Расеі, які стаў галоўнай крыніцай нашага эканамічнага росту. У 2009 годзе аб'ём гандлю з Расеяй можа скараціцца напалову.***

Лякаматыў расейскай эканомікі ўпэўнена цягнуў нас да дабрабыту, а цяпер набірае хуткасьць у бездань вытворчага і структурнага крызысу.

У 2008 г. Беларусь нагандлявала з Расеяй на $34,1 млрд. – на 31,1% больш, чым у 2007 г. Ад продажу тавараў расейцам атрымана $10,6 млрд. (прырост за год на 19,2%), у іх набыта на $23,6 млрд. Адмоўнае сальда гандлю пабіла ўсе рэкорды – $13 млрд. Гэта на $4,7 млрд. больш, чым у 2007 г. Калі па інвэстыцыйных і спажывецкіх таварах у нас сальда дадатнае, то па прамежкавых – вялізны мінус.

У 2009 г. аб'ём гандлю з Расеяй можа скараціцца напалову – ужо студзеньскія дадзеныя дазваляюць сфарміраваць настолькі трывожныя чаканьні. Чысты прыбытак прамысловых


photo.bymedia.net

прадпрыемстваў у студзені 2009 г. у значнай ступені тлумачыцца рэзкім пагаршэньнем кан'юнктуры расейскага рынку (скарацілася на 82,7%). Валавы прыбытак упаў на 72,2% пры росьце коштаў вытворцаў прамысловай прадукцыі на 19,9% (студзень 2009 г. да студзеню 2008 г.).

*«Белгазета»*

КУЛЬТУРА

## Беларускі журналіст 4 гады пісаў кнігу пра народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава

***Першапачаткова кніга задумвалася як аднатомнік, але за чатыры зь лішкам гады карпатлівай працы Сяргей Шапран сабраў такую колькасьць успамінаў і дакумэнтальных сьведчаньняў пра Быкава, што ледзьве ўклаўся ў два тоўстыя тамы. Пакуль выйшаў першы – аб'ёмам больш чым у 700 старонак. Другі том аўтар спадзяецца ўбачыць у чэрвені, да дня народзінаў Быкава.***




Такіх працаў пра Быкава яшчэ не было – у кнізе сотні спасылак на публікацыі ў пэрыёдыцы больш чым за паўстагодзьдзя, а таксама архіўныя матэрыялы: лісты, якія ніколі не публікаваліся, стэнаграмы выступаў і абмеркаваньняў, дакладныя ў ЦК, рукапісы і машынапісы самога пісьменьніка. За гэтыя гады журналісту давялося папрацаваць з дакумэнтамі больш чым з дваццаці дзяржаўных архіваў і музэяў і прыватных архіваў, у Нацыянальнай бібліятэцы.

Сяргею Шапрану ў ягонай працы дапамаглі вельмі многія: у кнізе ёсьць успаміны пісьменьнікаў Чынгіза Айтматава, Сьвятланы Алексіевіч, Рыгора Бакланава, Барыса Васільева, Уладзімера Някляева, Міхася Тычыны, а таксама крытыкаў Лазара Лазарава і Валянціна Аскоцкага. У гэтым жа шэразе Іна Карпюк, дачка Алеся Адамовіча Натальля, Зянон Пазьняк, Станіслаў Шушкевіч.

*«Комсомольская правда в Беларуси»*

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

Асацыяцыя журналістаў беларуская

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

польская дапамога

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.